П. Р. ІГНАТОВІЧ

# НАВУКОВАЕ КРЭДА ЯЎСТАХА ТЫШКЕВІЧА / EUSTACHE TIŠKEVIČIAUS MOKSLO KREDO

P. IGNATOVICH

# SCIENTIFIC CREDO OF YAUSTAKH TYSHKEVICH

*In the article «The scientific credo» describes the life and scientific path of the representative of the famous Belarusian Count family, of the archaeologist, ethnographer, curator of the museums, folklorist and patron Count Yaustakhe Tyshkevich. The activity for archaeological research on the Belarusian land, popularization of scientific knowledge, the preparation and publication of the monograph «The Discription of the Borisov Povet» are reflected in the article. The author considers the foundation of Vilna Ancientry Museum and Archaeological Commission became the crown of the scientific working of Y. Tyshkevich.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыкметны след у жыцці беларускага народа пакінула магнацкая лінія Тышкевічаў, а найперш браты Яўстах і Канстанцін. Іх бацька Пій Феліцыянавіч Тышкевіч (1756–1858) разам з клопатамі эканамічнага кшталту шмат рабіў для памнажэння культурнай спадчыны ў родным Лагойску: пісаў сямейную хроніку, папаўняў бібліятэку і мастацкую галерэю, арганізоўваў камерныя і сольныя канцэрты, быў выдатным рэзчыкам па дрэве і інкрустатарам. Ён таксама шмат дапамагаў сваім сынам Канстанціну і Яўстаху ў іх навуковых пошуках.

Станоўчы ўплыў на дзяцей аказала іх маці Аўгусціна Плятарская. Яна паходзіла са знатнага нямецкага роду, што здаўна асеў на Падзвінні. Нягледзячы на клопаты па выхаванні дзяцей, Аўгуста падзяляла мужава, а пазней і сваіх сыноў Канстанціна і Яўстаха захапленне мастацтвам, зборам антыкварыяту, рукапісных кніг, дакументаў гісторыі і г.д. [3, с. 10]. Яна сабрала вялікую калекцыю дакументаў (у тым ліку ўнікальных рукапісаў), кніг, карцін, старажытных прадметаў.

Пасля пачатковай адукацыі Яўстах у 1824 г. (дзесяцігадовым падлеткам) накіроўваецца ў Вільню вучыцца ў гімназіі. У Вільні для юнака былі створаны прывабныя ўмовы. Яго нават апекаваў прафесар універсітэта Ян Вашкевіч і іншыя дасведчаныя людзі. Але праз некаторы час Яўстах, як сцвярджае Г. А. Каханоўскі, па невядомых прычынах спыняе вучобу ў Вільні і пераводзіцца ў Мінскую гімназію. І хоць тагачасны Мінск не быў цэнтрам навукі, але пра мясцовую гімназію гаварылі і пісалі з павагай як пра

асяродак перадавой грамадска-дэмакратычнай думкі [3, с. 12–13]. Як пакажа далей гісторыя, менавіта ў гэтых сценах спасцігалі веды, далучаліся да здабыткаў беларускай культуры, набывалі вопыт культурнай і сацыяльна-палітычнай дзейнасці многія знакамітыя прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі.

У цэнтры Мінска па адрасе: плошча Свабоды, 23 – стаіць будынак, які хораша ўпісваецца ў сучасную прастору старадаўняй плошчы; намаганнямі ўладных структур, архітэктараў, будаўнікоў яна сёння адроджана і выглядае вельмі прывабна.



Зараз тут месцяцца розныя службы Федэрацыі прафсаюзаў. Справа ад уваходу ў будынак усталявана мемарыяльная дошка з тэкстам: «Тут у 1803 годзе была адкрыта Мінская гімназія, у якой у розныя часы вучыліся Тамаш Зан (1796–1855), Яўстафій Тышкевіч (1814–1873), Станіслаў Манюшка (1818–1872), Уладзімір Стасевіч (1829–1906), Бенядзікт Дубоўскі (1833–1930), Аляксандр Ельскі (1834-1916), Антон Трусаў (1835–1886), Іван Гольц-Мілер (1842–1871), Янка Лучына (Іван Неслыхоўскі) (1851–1897), Мікалай Мінскі-Віленкін (1855–1937), Эдуард Пякарскі (1858–1934), Ядвігін Ш. (А. Лявіцкі) (1862–1922) і іншыя дзеячы літаратуры, мастацтва, навукі…»




Скончыў Мінскую гімназію Яўстах у 1831 г. і больш ніякай навучальнай установы не наведваў. Заўважым, што прынамсі цягам аднаго года адначасова навучаліся ў Мінскай гімназіі стаўшыя ў будучым вядомымі дзеячамі навукі і культуры Яўстах Тышкевіч і Станіслаў Манюшка. І хоць розніца ва ўзросце гімназістаў складала пяць гадоў, дазволім сабе дапушчэнне: не выключана, што гімназічныя сцежкі гэтых дзвюх асоб маглі перасячыся, што Яўстах мог наведваць дом Манюшкаў на Высокім рынку, дзе часта збіралася мінская інтэлігенцыя.

Дарэчы, аднадушна сцвярджаюць даследчыкі, на станаўленне іх абодвух як творчых асоб велізарны ўплыў аказала жыццё ў абставінах блізкасці да беларускай прыроды, народных традыцый. Родам з Лагойшчыны, Яўстах сябраваў са сваімі сялянскімі аднагодкамі, з імі ён не раз узбіраўся на Паненскую гару, адкуль добра праглядваліся далёкія ваколіцы. Найвясялейшым святам для хлопчыкаў было Купалле, начныя рытуальныя вогнішчы, песні, скокі, легенды і паданні – сведчанні любві да родных мясцін яе насельнікаў і еднасці з прыродай, пачуцця адказнасці за іх захаванасць перад нашчадкамі [3, с. 12].

У снежні 1833 г. Я. Тышкевіч пачаў службу ў Пецярбургу ў Ордэнскім капітуле – вельмі прэстыжнай установе, якая падпарадкоўвалася толькі цару і сенату. У 1835 г. Я. Тышкевіч пераехаў у Вільню, а потым у Харкаў, дзе працаваў у канцылярыях генерал-губернатараў. У 1840 г. стаў ганаровым куратарам школ Барысаўскага павета. У 1844 г. шляхта Барысаўскага павета абрала яго сваім маршалкам. У 1848–1854 гг. Я. Тышкевіч – куратар Мінскай гімназіі, той гімназіі, якую сямнаццаць гадоў таму сам скончыў. У 1848 г. перадаў Барысаўскаму павятоваму вучылішчу пабудаванае ім на ўласныя сродкі новае памяшканне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковую дзейнасць Я. Тышкевіч пачаў у 1837 г. з раскопак кургаоў у ваколіцах Лагойска. У гэтым жа годзе ў «Tygodnik Peterburski» (1837, № 94) з'явілася паведамленне аб гэтых раскопках. Малады даследчык пісаў, што курганы, згодна з народнай традыцыяй, лічыліся недатыкальнымі і ён «павінен быў шчодра плаціць сваім прыгонным, працаваць разам з імі, каб яны згадзіліся на гэты грэх».

Што так прываблівала маладога навукоўца да вывучэння роднага краю, роднай зямлі, чаму яго вабілі курганы? Чаму ён ішоў на такія ахвяры?

Уражлівая душа Яўстаха Тышкевіча з самага маленства ўбірала ў сябе тое, што пакінулі на Лагойшчыне мінулыя часы. Яшчэ на пачатку навуковай дзейнасці асноўнай крыніцай, дзе ён чэрпаў веды пра свой край, а галоўнае – само натхненне, былі не толькі бацькава бібліятэка, але і ўнікальныя помнікі старажытнасці, пра якія ён чуў столькі легендаў і паданняў.

У народных паданнях, міфалогіі, фальклорнай традыцыі, у мастацкім асэнсаванні курган становіцца сімвалам унутранага ўзвышэння над нізкім, побытавым, зямным, ён супрацьпастаўляецца зямлі, што ляжыць ля яго падножжа і ўвасабляе практычнае, штодзённае, звычайнае [2, с. 60–61]. «Курганы ўзвышаюцца над звычайнай роўнаддзю і рвуцца ўвысь, бо хаваюць у сабе вечнасць гэтай зямлі, патаемныя загадкі яе гісторыі, былую духоўную веліч, усё ўзнёслае і прысветленае. Яны, быццам скарбніцы мінулай славы роднага краю, заклінальны напамінак пра напружанае духоўнае жыццё» [1, с. 152]. Вобраз кургана як увасабленне гістарычнай памяці прапаведуе Я. Купала. «Курган як бы злучае Прыроду і Культуру, ён на перасячэнні часоў мінулага і сучаснага» [6, с. 52].

Я. Тышкевіч штолета ладзіць экспедыцыі па Міншчыне (пераважна па Барысаўшчыне, і асабліва Лагойшчыне). Яму аказваюць значную дапамогу бацька, старэйшы брат Канстанцін. Браты раздзялілі сферы дзейнасці.

Практыка раскопак кургаоў дала вучонаму вельмі шмат. Дабытыя пры раскопках багатыя археалагічныя матэрыялы разам з іншымі рарытэтамі (калекцыі манет і гербаў, старадаўнія рукапісы і кнігі, зброя рыцараў і творы мастакоў, рэчы замежнага паходжання і інш.) далі магчымасць стварыць хатні музей. І хоць афіцыйная цырымонія адкрыцця такіх музеяў, як правіла, не праводзілася, лічыцца, што музей быў адкрыты для наведвальнікаў у 1842 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адначасова з археалагічнымі раскопкамі Я. Тышкевіч на працягу дзесяці гадоў збірае матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, тапаніміцы, вуснай народнай творчасці роднай зямлі, мяркуючы ўключыць у будучую кнігу. Для ўдзелу ў гэтай высокароднай справе ён прыцягвае шмат людзей розных інтарэсаў і схільнасцей. Над кнігай працавалі К. Адамовіч, П. Чачот, М. Чарноцкі, Ф. Чаховіч, В. Твардоўскі, Я. Ваньковіч, К. Тышынскі, старэйшы брат Канстанцін. Галоўная роля ў падрыхтоўцы кнігі, безумоўна, адводзілася Яўстаху Тышкевічу, які аб'ядноўваў вопыт і веды сваіх памочнікаў. Для работы над архіўнымі матэрыяламі Я. Тышкевіч не раз выязджаў у Мінск, Вільню, Пецярбург, Маскву.

Прайшло дзесяць гадоў нялёгкай працы, і нарэшце ў 1847 г. у Вільні ўбачыла свет кніга «Opisanie powiatu Borysowskiego». Па сваёй форме і сутнасці гэта краязнаўчая манаграфія. У ёй адлюстравана гісторыя развіцця Барысава, пачынаючы ад звестак пра яго засяленне і да апошняга часу. У кнізе прыводзяцца каштоўныя звесткі пра Лагойск, гісторыю Лагойскага графства, апісанне мясцовага замка і размешчанага ў ім музея. Актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы кнігі брат Канстанцін, падтрымліваў братоў і іх бацька Пій Феліцыянавіч.

Найбольш важнай жыццёвай справай Я. Тышкевіча было стварэнне Віленскага музея старажытнасцей і археалагічнай камісіі пры ім.

Навуковая дзейнасць музея набыла дастаткова шырокі рэзананс. Пра музей ведалі ў Маскве, Кіеве, Пецярбургу, Кракаве, Адэсе. У 1862 г. у Вільню прыязджаў ужо тады прызнаны гісторык М. І. Кастамараў (1817–1885), які сустракаўся з Я. Тышкевічам, А. Кіркорам, У. Сыракомлем, А. Адынцом, М. Маліноўскім. Яго вельмі ўразіла дзейнасць музея, і ў той жа час ён на свае вочы пабачыў нялёгкае жыццё гэтых энтузіястаў. «Гэта кола літаратараў было ў няласцы ў тагачасных польскіх патрыётаў, якія глядзелі на іх як на здраднікаў агульнай справы» [3, с. 35].

Вынікі працы Я. Тышкевіча прывялі да прызнання яго заслуг з боку навуковай грамадскасці. У выніку ў 1859 г. ён абіраецца ганаровым членам Пецярбургскай акадэміі навук.

«Абавязак кожнага адукаванага і ўлюбёнага ў свой край чалавека старацца растлумачыць усё, што падпала пад сумненне і складае матэрыял для айчыннай гісторыі. Здагадвацца, шукаць, адкрываць, а адкрытае перадаваць людзям – значыць падаваць руку дапамогі тым, хто прысвяціў жыццё сваё і здароўе для дабра грамадскага» [3,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

с. 63]. Гэтыя словы, сказаныя Я. Тышкевічам яшчэ ў маладыя гады, сталі яго навуковым крэда на ўсё жыццё. У душы прысягнуўшы служыць на карысць роднага краю, браты Тышкевічы ніколі не адступалі ад сваіх перакананняў.

Усімі прызнаны вучоны – член Дацкага каралеўскага таварыства аматараў паўночных старажытнасцей, Стакгольмскай каралеўскай акадэміі выяўленчага мастацтва і старажытнасцей, Лонданскага археалагічнага інстытута, ганаровы член Пецярбургскай акадэміі навук, – у апошнія гады ён адчуваў сябе забытым, ва ўсякім выпадку ён сам так думаў. Сціпласць адданага справе навукоўца …

---

1. *Каваленка, В. А.* Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. А. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 320 с.

2. *Кажухоўская, Л. С.* Базісныя сімвалы нацыянальнай мастацкай карціны свету беларусаў / Л. С. Кажухоўская. – Мінск : РІВШ БДУ, 2002. – 117 с.

3. *Каханоўскі, Г. А.* Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г. А. Каханоўскі, А. Г. Каханоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63 с.

4. *Мальдзіс, А. Г.* Падарожжа ў XIX стагоддзе. З гісторыі беларускай літаратуры, мастацтва і культуры / А. Г. Мальдзіс. – Мінск : Нар. асвета, 1969. – 206 с.

5. *Шаладонава, Ж. С.* Фарбы быту і жыцця ў паэме Я. Коласа «Новая зямля» / Ж. С. Шаладонава. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 103 с.

6. *Шамякіна, Т.* Зорнае неба над намі. Астральныя міфы і разуменне космасу ў народаў свету / Т. Шамякіна // Роднае слова. – 1994. – № 6. – С. 64–71.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ